


## § 8. Фактары і віды міграцыі насельніцтва

***Успомніце.*** Што такое міграцыя? Якія прычыны выклікаюць міграцыю насельніцтва?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Як уплывае міграцыя на дэмаграфічную сітуацыю ў краіне? З якімі праблемамі сутыкаюцца мігранты ў краіне, якая іх прымае?

**Фактары міграцыі насельніцтва.** Міграцыя насельніцтва аказвае значнае ўздзеянне на геаграфію, структуру і дынаміку колькасці насельніцтва асобных населеных пунктаў, краін і свету. На яе ўплывае мноства фактараў. У найбольш абагульненым выглядзе сярод іх вылучаюць некалькі груп (мал. 52). Як правіла, сукупнае дзеянне фактараў вызначае міграцыйную рухомасць насельніцтва. Пры гэтым эканамічны фактар гістарычна з'яўляецца вызначальным.

$П_1$

Адным з першых вучоных, які яшчэ ў 1885 г. паспрабаваў у абагульненым выглядзе прадставіць фактары міграцыі і распрацаваў на іх аснове *законы міграцыі*, быў Э. Г. Равенштайн (мал. 52-1). Асноўныя з іх паказаны на малюнку 52-2.

Фактары міграцыі можна таксама падзяліць на *фактары, якія выштурхваюць*, і *фактары, якія прыцягваюць*. Да першай групы адносяцца беднасць, голад, нізкі ўзровень жыцця і заработнай платы, перанаселенасць краін, якія развіваюцца, высокі ўзровень беспрацоўя, экалагічныя катастрофы, войны, канфлікты, праследы і г. д. У другую групу ўключаны больш высокі ўзровень жыцця і аплаты працы, дэфіцыт уласных працоўных рэсурсаў у развітых краінах, спрыяльныя прыродна-кліматычныя ўмовы.



Мал. 52-1. Э. Г. Равенштайн (1834–1913) — аўтар законаў міграцыі

**ПРЫРОДНЫЯ**
- аказваюць апасродкаваны ўплыў, іх роля слабее па меры росту ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця
- спрыяльныя для пражывання прыродна-кліматычныя ўмовы ствараюць перадумовы для прытоку насельніцтва

**ЭКАНАМІЧНЫЯ**
- развіццё эканомікі на тэрыторыях спрыяе стварэнню новых працоўных месцаў і стымулюе прыток насельніцтва і наадварот
- больш высокі ўзровень даходаў спрыяе прытоку насельніцтва з краін, дзе гэтыя даходы ніжэйшыя

**ДЭМАГРАФІЧНЫЯ**
- стварэнне і распад сям'і ўздзейнічае на міграцыю насельніцтва

**ПРАВАВЫЯ**
- узмацненне жорсткасці прававых норм зніжае міграцыйную рухомасць насельніцтва
- паслабленне прававых норм спрыяе ўзмацненню міграцыі насельніцтва

**ПАЛІТЫЧНЫЯ**
- змена палітычнага рэжыму, рэпрэсіі па палітычных матывах прыводзяць да міграцыйнай актыўнасці насельніцтва

**ЭКАЛАГІЧНЫЯ**
- тэхнагенныя і экалагічныя катастрофы ўзмацняюць адток насельніцтва

Мал. 52. Фактары міграцыі насельніцтва

| | |
|---|---|
| Закон 1 | Больш за ўсё міграцый ажыццяўляецца на кароткія адлегласці |
| Закон 2 | Чым буйнейшы населены пункт, тым больш прывабным для міграцыі ён з'яўляецца |
| Закон 3 | Кожнай міграцыйнай плыні адпавядае свая контрплынь |
| Закон 4 | Рост буйных гарадоў у большай ступені абумоўлены міграцыяй насельніцтва, чым натуральным прыростам |
| Закон 5 | Маштабы міграцыі ўзрастаюць з развіццём прамысловасці, гандлю і транспарту |
| Закон 6 | Эканамічныя прычыны міграцыі з'яўляюцца вызначальнымі |

Мал. 52-2. Законы міграцыі

***У свеце ўсё ўзаемазвязанае.*** 1. Прывядзіце прыклады станоўчага і адмоўнага ўплыву міграцый на сацыяльна-эканамічнае развіццё краін і рэгіёнаў прыбыцця і выбыцця. 2. Якія літаратурныя творы, дзе закранался тэма міграцыі насельніцтва, вы чыталі?

**Віды міграцый.** У сучасным свеце існуе вялікая разнастайнасць міграцый. У сукупнасці міграцыі класіфікуюць на розныя віды ў залежнасці ад характару прасторавых перамяшчэнняў (мал. 53, 54).

<table>
<tr><td colspan="6">1. Міграцыі па часе</td></tr>
<tr><td colspan="3">пастаянныя</td><td colspan="3">часовыя</td></tr>
<tr><td colspan="6">2. Міграцыі па геаграфічным ахопе</td></tr>
<tr><td colspan="3">знешнія (міжнародныя)</td><td colspan="3">унутраныя (унутрыдзяржаўныя)</td></tr>
<tr><td colspan="6">3. Міграцыі па прычынах/мэтах</td></tr>
<tr><td>эканамічныя</td><td>палітычныя</td><td>экалагічныя</td><td>этнічныя</td><td>дэмаграфічныя</td><td>рэлігійныя</td></tr>
<tr><td colspan="6">4. Міграцыі па форме арганізацыі</td></tr>
<tr><td colspan="3">арганізаваныя</td><td colspan="3">індывідуальныя</td></tr>
<tr><td colspan="6">5. Міграцыі па характары</td></tr>
<tr><td colspan="3">добраахвотныя</td><td colspan="3">прымусовыя</td></tr>
<tr><td colspan="6">6. Міграцыі па ступені законнасці</td></tr>
<tr><td colspan="3">легальныя</td><td colspan="3">нелегальныя</td></tr>
</table>

Мал. 53. Віды міграцый




Мал. 54. Міграцыі па часе

**Свет і Беларусь.** Беларусь стала домам для вялікай колькасці грамадзян з розных краін. Іншаземцаў прыцягваюць дабрабыт, стабільнасць, магчымасць развіваць бізнес, высокі ўзровень адукацыі і, вядома ж, мір, які дзяржава ўсімі сіламі падтрымлівае ў нашай краіне. З якіх краін у Рэспубліку Беларусь прыязджаюць мігранты?

Вывучэнне міграцыі дазваляе адказаць на многія пытанні. Напрыклад, колькі выехала насельніцтва, хто выехаў, куды выехаў і г. д. Існуюць паказчыкі вывучэння міграцыі. Іх можна падзяліць на некалькі груп: паказчыкі маштабаў міграцыі; адносныя паказчыкі міграцыі; паказчыкі структуры міграцыі і інш.

Да *паказчыкаў маштабаў міграцыі* адносяць наступныя (мал. 55).

**1. Колькасць мігрантаў, якія прыбылі (П), чал.**

**2. Колькасць мігрантаў, якія выбылі (В), чал.**

**3. Сальда міграцыі (+/–), або міграцыйны прырост (змяншэнне), чал.**
Разлічваецца як розніца паміж колькасцю мігрантаў, якія прыбылі, і мігрантаў, якія выбылі, за пэўны перыяд (звычайна год) для краіны, рэгіёна, горада, раёна па формуле: МП (МЗ) = П – В.
Калі паказчык дадатны, выкарыстоўваецца тэрмін «міграцыйны прырост» (МП), калі адмоўны — «міграцыйнае змяншэнне» (МЗ).

**4. Валавая міграцыя (ВМ), або міграцыйны абарот (МА)**
Разлічваецца як сума колькасці мігрантаў, якія прыбылі, і мігрантаў, якія выбылі, па формуле: ВМ (МА) = П + В.

Мал. 55. Асноўныя абсалютныя паказчыкі вывучэння міграцыі

Асноўнымі *адноснымі паказчыкамі міграцыі* з'яўляюцца каэфіцыенты інтэнсіўнасці прыбыцця, выбыцця і міграцыйнага абароту. Яны разлічваюцца як адносіны колькасці тых, хто прыбыў, тых, хто выбыў, і міграцыйнага абароту адпаведна да сярэднегадавой колькасці насельніцтва ў разліку на 1000 чал. і вымяраюцца ў праміле.

Формулы для разліку адносных паказчыкаў міграцыі паказаныя на малюнку 55-1.

$П_2$

| | |
|---|---|
| 1. Каэфіцыент інтэнсіўнасці прыбыцця | Формула для разліку: К = П / Кн х 1000 |
| 2. Каэфіцыент інтэнсіўнасці выбыцця | Формула для разліку: К = В / Кн х 1000 |
| 3. Каэфіцыент інтэнсіўнасці міграцыйнага абароту | Формула для разліку: К = МА / Кн х 1000 |

Мал. 55-1. Асноўныя адносныя паказчыкі міграцыі

*Паказчыкі структуры міграцыі* паказваюць на тое, якімі з'яўляюцца мігранты паводле полу, узросту, краіны выезду/уезду, прафесіі, адукацыі, узроўню даходаў, шлюбнага стану і іншых прыкмет. Таму для іх разліку выкарыстоўваюцца адносіны колькасці людзей з пэўнай прыкметай да агульнай колькасці мігрантаў, вымяраюцца ў працэнтах.

**Міграцыйны пераход.** Чалавецтва ў розныя перыяды спрабавала даваць тлумачэнні прычынам і асаблівасцям міграцыі насельніцтва ў залежнасці ад змен сацыяльна-эканамічных умоў (аналагічна тэорыі дэмаграфічнага пераходу). Гэта знайшло адлюстраванне ў канцэпцыі міграцыйнага пераходу В. Зялінскага (мал. 56). Канцэпцыі дэмаграфічнага і міграцыйнага пераходаў цесна звязаныя і дапаўняюць адна адну.

***Паразважаем.*** Дэмаграфічнае развіццё і роля міжнароднай міграцыі ў гэтым працэсе істотна адрозніваюцца ў развітых рэгіёнах і рэгіёнах свету, якія развіваюцца. Пацвердзіце або аспрэчце дадзенае выказванне.

***Міграцыйны пераход*** — гэта эвалюцыя міграцыі насельніцтва, якая адлюстроўвае заканамерны пераход ад нізкай міграцыйнай рухомасці на аграрнай стадыі да яе росту ў перыяд індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства ў выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

Згодна з канцэпцыяй, існуе пяць стадый міграцый насельніцтва, якія змяняюцца паралельна сацыяльным і эканамічным зменам у грамадстве (мал. 57).



Мал. 56. В. Зялінскі, аўтар канцэпцыі міграцыйнага пераходу




Мал. 57. Стадыі міграцыйнага (мабільнага) пераходу

На *першай стадыі* ў даіндустрыяльным грамадстве міграцыя абмежаваная. Маюць месца толькі нязначныя перамяшчэнні людзей па прылеглай тэрыторыі пры нязначным натуральным прыросце, высокай нараджальнасці і высокай смяротнасці насельніцтва. Да цяперашняга часу ўсе краіны свету завяршылі гэтую стадыю.

*Другая стадыя* характарызуецца міграцыяй з вёскі ў горад, ростам перамяшчэнняў на больш далёкія адлегласці, агульным ростам маштабаў міжнароднага міграцыйнага руху. Сёння на гэтай стадыі знаходзіцца невялікая колькасць найменш развітых краін, пераважна Афрыкі (напрыклад, Намібія, Эфіопія), Азіі (напрыклад, Бутан, Непал), і іх колькасць скарачаецца.

На *трэцяй стадыі* захоўваецца рух з вёскі ў горад пры хуткім павелічэнні міграцыі паміж гарадамі. Маштабы міграцыі ўзрастаюць. Прысутнічаюць усе спалучэнні міграцыі гарадскога і сельскага насельніцтва. Гэтая стадыя прадстаўленая ў большасці краін Лацінскай Амерыкі, Азіі, шэрагу краін Афрыкі, якія развіваюцца (напрыклад, ПАР, Егіпет, Нігерыя), некаторых краінах з пераходнай эканомікай (напрыклад, Польшча, Венгрыя, Расія).

На *чацвёртай стадыі* ў познім індустрыяльным і постындустрыяльным грамадстве пры нязначным натуральным прыросце міграцыя з вёскі ў горад у пэўнай ступені захоўваецца, але мае малыя маштабы. Атрымлівае развіццё адваротны міграцыйны рух з горада ў вёску. Узрастаюць аб'ёмы міграцыі з больш буйных па колькасці насельніцтва гарадоў у больш дробныя. Адбываецца значны рост міжнароднай міграцыі. Гэтая стадыя ў асноўным характэрная для развітых краін Еўропы (напрыклад, Германія, Вялікабрытанія, Нідэрланды), часткова прадстаўленая ў ЗША. Шэраг найбольш развітых краін Лацінскай Амерыкі таксама набывае рысы гэтай стадыі (напрыклад, Бразілія, Мексіка).

*Заключная (пятая) стадыя* разглядаецца як гіпатэтычная стадыя постындустрыяльнага грамадства. Для яе будуць характэрныя пераважна міжгарадская міграцыя і пэўныя перасяленні з горада ў вёску. Міжнародная міграцыя захоўваецца, але кантроль з боку дзяржавы ўзмацняецца.

**У свеце цікавага.** У сувязі з заключнай стадыяй развіцця міграцыі выклікае цікавасць меркаванне італьянскага вучонага П. Прыні пра тое, што «выразнікам сутнасці нашай эпохі з'яўляецца хутчэй качэўнік — чалавек, які вандруе з краю ў край» і што ў постындустрыяльным грамадстве «ўсе людзі, незалежна ад сваёй культуры, будуць мігрыраваць». З гэтым сцвярджэннем узгадняецца і канцэпцыя Трэцяга дэмаграфічнага пераходу Д. Коўлмэна.

**Падвядзём вынікі.** На міграцыю насельніцтва аказваюць уплыў многія фактары, асноўным з якіх з'яўляецца … . Міграцыі адрозніваюцца па …, …, …, …, …, … . Сярод паказчыкаў міграцыі вылучаюць тры асноўныя групы: паказчыкі маштабаў міграцыі; адносныя паказчыкі міграцыі; паказчыкі структуры міграцыі. Вылучаюць … стадый міграцыйнага пераходу. Міграцыйны пераход уяўляе сабой змену нізкай міграцыйнай рухомасці насельніцтва на аграрнай стадыі да яе росту ў перыяд індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства ў выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

***Праверым свае веды.*** 1. Назавіце асноўныя фактары міграцыі. 2. Што такое міграцыйны пераход? 3. Прывядзіце прыклады міграцый па прычынах. 4. Якія міграцыйныя працэсы характэрныя для вашай мясцовасці?

***Ад простага да складанага.*** На малюнку схематычна прадстаўленая мадэль прыняцця рашэння аб міграцыі. З дапамогай малюнка 58 адкажыце на наступныя пытанні: 1. Што пазначана знакамі плюс і мінус у кругах, якія сімвалізуюць рэгіёны выбыцця і прыбыцця мігрантаў? 2. Назавіце тры фактары, якія могуць разглядацца як «прамежкавыя перашкоды».



Мал. 58. Схема «прыцягвання — адштурхоўвання» (у адпаведнасці з міграцыйнай тэорыяй Э. С. Лі)

***Ад тэорыі да практыкі.*** Правядзіце міні-даследаванне «Мая сям'я». Даведайцеся, ці пераязджалі вашы сваякі ў іншыя краіны або з іншых краін, і падрыхтуйце сціслае паведамленне пра тое, як гэта паўплывала на вашу сям'ю.

## § 9. Міжнародная міграцыя ў сучасным свеце

***Успомніце.*** Праблемы якога характару прыводзяць да міжнароднай міграцыі? Успомніце падзеі, якія выклікалі найбольш маштабныя перамяшчэнні людзей у гісторыі чалавецтва. Якія праблемы яны выклікалі?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Што неабходна прадпрымаць дзяржаве, каб не дапусціць значных маштабаў эміграцыі? Да якіх праблем вядзе міжнародная міграцыя?

**Дынаміка маштабаў міжнароднай міграцыі ў свеце і рэгіёнах.** З сярэдзіны XX ст. пачынаецца сучасная эпоха міграцыі насельніцтва свету. Гістарычным яе пачаткам было заканчэнне Другой сусветнай вайны, а галоўнай асаблівасцю — значны рост маштабаў міжнароднай міграцыі. На палітычнай карце свету не засталося дзяржаў, якія не былі б уцягнутыя ў міжнародную міграцыю. У параўнанні з 1970 г. колькасць міжнародных мігрантаў у свеце ўзрасла ў 3,3 разу і склала ў 2020 г. 280,6 млн чал., або 3,6 % насельніцтва свету. Міжнародная міграцыя набыла глабальны характар.

| Год | Колькасць міжнародных мігрантаў, чал. | Доля міжнародных мігрантаў у насельніцтве свету, % |
|---|---|---|
| 1970 | 84 460 125 | 2,3 |
| 1975 | 90 368 010 | 2,2 |
| 1980 | 101 983 149 | 2,3 |
| 1985 | 113 206 691 | 2,3 |
| 1990 | 152 986 157 | 2,9 |
| 1995 | 161 289 976 | 2,8 |
| 2000 | 173 230 585 | 2,8 |
| 2005 | 191 446 828 | 2,9 |
| 2010 | 220 983 187 | 3,2 |
| 2015 | 247 958 644 | 3,4 |
| 2020 | 280 598 105 | 3,6 |

Мал. 58-1. Дынаміка колькасці міжнародных мігрантаў

***У свеце ўсё ўзаемазвязанае.*** Якія падзеі спрыяюць актывізацыі міжнароднай міграцыі? миграции? Почему она стала глобальным процессом?

**У свеце цікавага.** У гісторыі чалавецтва класічнай краінай эміграцыі ў XIX ст. была Ірландыя. За некалькі дзесяцігоддзяў пасля Вялікага голаду ў 1840-х гг. (мал. 59) насельніцтва гэтай краіны зменшылася ў два разы. У Новы Свет з Ірландыі прыбыло 5000 караблёў з эмігрантамі. Усяго на амерыканскі бераг ступіла крыху больш за мільён чалавек. Па долі эмігрантаў Ірландыя заняла першае месца ў свеце.

У цяперашні час у Ірландыі пражывае толькі палова ўсіх этнічных ірландцаў.



Мал. 59. Помнік ахвярам Вялікага голаду ў Ірландыі

Еўропа з'яўляецца рэгіёнам з найбольшай колькасцю міжнародных мігрантаў (86,7 млн чал., або 30,9 % ад агульнай колькасці мігрантаў у свеце). Азія займае другое месца (85,6 млн чал., або 30,5 %). Паўночная Амерыка з'яўляецца трэцім па колькасці міжнародных мігрантаў рэгіёнам (58,7 млн чал., або 20,9 %).

Па колькасці міжнародных мігрантаў на 1000 жыхароў найбольшымі значэннямі вылучаецца Паўночная Амерыка (4,6 ‰). Тры рэгіёны (Афрыка, Паўднёвая Амерыка і Азія) характарызуюцца перавагай міграцыйнага адтоку (мал. 60).

У 2023 г. найбольшая колькасць міжнародных мігрантаў пражывала ў ЗША (51 млн чал.), Германіі (19 млн чал.), Саудаўскай Аравіі (13,4 млн чал.).



Мал. 60. Сальда міжнароднай міграцыі па рэгіёнах, 2023 г., ‰

Найбуйнейшымі краінамі паходжання міжнародных мігрантаў у 2023 г. былі Індыя, Мексіка і Расія (мал. 61). Таксама да краін з вялікай колькасцю мігрантаў адносяцца Кітай, Сірыя, Бангладэш.

Краінамі з найбольшай доляй імігрантаў у структуры насельніцтва з'яўляюцца **ААЭ** (88,4 %), **Кувейт** (75 %) і **Катар** (65,5 %).

П₂

Краінамі з найбольшай доляй эмігрантаў у структуры насельніцтва з'яўляюцца малыя па плошчы і астраўныя дзяржавы: Дамініка (49 %), Антыгуа і Барбуда (44 %), Сент-Кітс і Невіс (42 %). Гэта тлумачыцца адсутнасцю магчымасцей для маладога і працаздольнага насельніцтва атрымаць адукацыю, знайсці працу і інш.

У структуры міжнародных мігрантаў у 2023 г. пераважалі мужчыны — 52 %. Доля жанчын склала 48 % і пастаянна павялічваецца. Сярэдні ўзрост сучаснага мігранта павялічваецца і складае 39 гадоў. 74 % мігрантаў знаходзяцца ў працаздольным узросце (20–64 гады). 13 % ад агульнай колькасці міжнародных мігрантаў складаюць дзеці, малодшыя за 18 гадоў.



Мал. 61. Найбуйнейшыя краіны паходжання міжнародных мігрантаў, 2023 г., млн чал.

**Міграцыя ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца.** Галоўнай асаблівасцю міжнароднай міграцыі з'яўляецца ўзмацненне міграцыйнага адтоку з краін, якія развіваюцца, у развітыя. Развітыя краіны характарызуюцца дадатным

сальда міграцыі. У краінах, якія развіваюцца, назіраецца адмоўнае сальда міграцыі (мал. 62, 62-1).




Мал. 62. Дынаміка міжнароднай міграцыі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, ‰

***Паразважаем.*** Роля міграцыі ў дэмаграфічным развіцці істотна адрозніваецца ў развітых рэгіёнах свету і рэгіёнах, якія развіваюцца. Пацвердзіце або аспрэчце дадзенае меркаванне.

$П_3$

**Краіны з дадатным сальда міграцыі**

- Азія: Саудаўская Аравія, Іран, Тайланд
- Амерыка: ЗША, Канада, Аргенціна, Чылі
- Афрыка: ПАР, Чад, Кенія, Ангола
- Еўропа — большасць краін: Германія, Францыя, Нарвегія, Італія
- Аўстралія і Акіянія: Аўстралія, Новая Зеландыя

**Краіны з адмоўным сальда міграцыі**

- Азія: Індыя, Кітай, Непал, Турцыя, Афганістан
- Амерыка: Мексіка, Бразілія, Уругвай
- Афрыка: Судан, Лівія, Алжыр, Эфіопія
- Еўропа: Румынія, Малдова, Грэцыя, Чэхія
- Аўстралія і Акіянія: Тувалу, Тонга, Вануату

Мал. 62-1. Геаграфія і характар міжнароднай міграцыі (прыклады краін), 2023 г.

З канца 1980-х гг. наступіў *найноўшы перыяд міграцыі* насельніцтва. Ён характарызуецца дзеяннем палітычных, сацыяльна-эканамічных, экалагічных і лакальных фактараў. Асноўнымі падзеямі найноўшага перыяду міграцыі былі распад сацыялістычнай сістэмы гаспадарання, з'яўленне суверэнных дзяржаў і змяненне іх дзяржаўных меж, пашырэнне меж Еўрапейскага саюза.



**Свет і Беларусь.** Рэспубліка Беларусь у 2025 г. стала прымаць працоўных мігрантаў з краін, якія развіваюцца, Азіі і Афрыкі для папаўнення рынку працоўных рэсурсаў. У выступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі гаварылася: «Беларусь зацікаўленая перш за ўсё ў прыцягненні спецыялістаў, а не проста моладзі». Напрыклад, на працу ў Гродзенскі раён едуць пакістанцы, туркмены, грамадзяне афрыканскіх краін. Працоўных мігрантаў прыцягваюць добрыя ўмовы пражывання, працы і заробак. У якіх рэгіёнах і відах эканамічнай дзейнасці працоўныя мігранты найбольш запатрабаваныя ў нашай краіне?

Павелічэнне разрыву ва ўзроўні жыцця паміж эканамічна развітымі дзяржавамі і дзяржавамі, якія развіваюцца, і ў групе краін, якія развіваюцца, таксама выступае фактарам росту плыней міжнароднай міграцыі (мал. 63). Асноўнай з'яўляецца плынь міграцыі з краін, што развіваюцца, у развітыя (40 %). Аднак па прычыне павелічэння адрозненняў ва ўзроўні даходаў насельніцтва больш чым кожны трэці міжнародны мігрант сёння выязджае з краін, якія развіваюцца, у краіны, якія развіваюцца (напрыклад, з Гватэмалы ў Мексіку, з Бангладэш у Індыю). Гэтая ж прычына тлумачыць міграцыю з развітых у развітыя краіны, на якую прыпадае 22 % (напрыклад, з Іспаніі ў Германію).




Мал. 63. Асноўныя плыні міжнароднай міграцыі паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, 2022 г.

**Калідоры міжнароднай міграцыі.** Значныя маштабы міжнароднай міграцыі разам з гістарычнымі перадумовамі прывялі да фарміравання ўстойлівых і вялікіх па колькасці плыней мігрантаў паміж асобнымі краінамі. Гэта з'ява атрымала назву «міграцыйны калідор». У 2024 г. у свеце вылучаўся 21 калідор. Самым буйным з'яўляецца калідор паміж **Мексікай** і **ЗША**, дзе колькасць міжнародных мігрантаў складае каля 10 млн чал. (мал. 64).




Мал. 64. Асноўныя міграцыйныя калідоры свету, 2024 г., млн чал.

Пакажыце на палітычнай карце свету асноўныя калідоры міжнародных міграцый: Мексіка — ЗША; **Сірыя** — **Турцыя**; **Украіна** — **Расія**. Чым вы можаце растлумачыць іх фарміраванне?

Прычына міграцыі ў межах калідораў, як правіла, эканамічная — магчымасць знайсці працу насельніцтву краін, якія развіваюцца. Аднак у апошнія гады прычынай часта становяцца палітычныя падзеі ў краіне (напрыклад, у Сірыі (мал. 65)).

**Сучасныя віды міжнароднай міграцыі і іх геаграфія.** Асноўным відам міжнароднай міграцыі ў сучасным свеце з'яўляецца *працоўная міграцыя*. Яе фактарамі



Мал. 65. Нелегальныя сірыйскія мігранты на шляху ў Турцыю

выступаюць: адрозненні ва ўзроўні жыцця насельніцтва; прыцягненне таннай працоўнай сілы з краін, якія развіваюцца; узрослая залежнасць шэрага галін гаспадаркі і відаў эканамічнай дзейнасці развітых краін ад працы рабочых з краін, якія развіваюцца.

Колькасць працоўных мігрантаў у 2021 г. складала 169 млн чал., або 60 % міжнародных мігрантаў. З іх 66,2 % працавалі ў сферы паслуг, 26,7 % — у прамысловасці, 7,1 % — у сельскай гаспадарцы (мал. 66).




Мал. 66. Структура занятасці міжнародных працоўных мігрантаў, 2021 г., %

У структуры працоўных мігрантаў 58,5 % складаюць мужчыны і 41,5 % — жанчыны. Дарослыя ва ўзросце 25–64 гадоў складаюць 86,5 % ад усіх рабочых-мігрантаў (мал. 67).




Мал. 67. Полаўзроставая піраміда міжнародных працоўных мігрантаў, 2022 г.

П4

Па даных Міжнароднай арганізацыі міграцыі, у структуры працоўнай міграцыі першае месца належыць спецыялістам медыцынскай сферы пераважна з краін, якія развіваюцца. Гэта тлумачыцца некалькімі прычынамі: 1) нізкай аплатай працы; 2) абмежаванымі магчымасцямі кар’ернага росту; 3) дрэннымі ўмовамі працы (карупцыя, састарэлае абсталяванне); 4) палітычнай нестабільнасцю, войнамі і гвалтам.

Сёння ў свеце налічваецца больш за 5 млн міжнародных мігрантаў медыцынскай сферы. Азія з'яўляецца рэгіёнам, з якога ажыццяўляецца найбольш маштабная эміграцыя медыцынскага персаналу (41 % міжнародных мігрантаў). Другое месца займае Лацінская Амерыка (34 %) (мал. 67-1).




Мал. 67-1. Эміграцыя медыцынскіх работнікаў па рэгіёнах свету, 2020 г., %

Больш чым кожны пяты замежны доктар (22 %) родам з Індыі, 25 % — з Канады, Кітая, Ірана, Рэспублікі Карэя, Пакістана і Філіпін (па 3–6 %). Філіпіны на сённяшні дзень з'яўляюцца вядучай краінай па колькасці медсясцёр, якія эміграваліі. 25 % медсясцёр паходзяць з Канады, Індыі, Ямайкі і Нігерыі (па 3–6 %). Найбольшая доля медсясцёр у структуры эміграцыі працоўнай сілы прыпадае на краіны Карыбскага рэгіёна: Гаіці (94 %), Ямайку (87,7 %), Грэнаду (87,6 %) (мал. 67-2).

| **Доля эмігрантаў — медыцынскіх работнікаў у агульнай колькасці медыцынскіх работнікаў у краіне, %** | **Рэгіёны** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Азія | Амерыка | Афрыка | Еўропа | Аўстралія і Акіянія |
| 10–30 | Лаос, Пакістан, Афганістан, Малайзія | Канада, Перу, Балівія | Судан, Нігер, Намібія, ПАР | Фінляндыя, Швецыя, Румынія | Новая Зеландыя |
| Больш за 30 | Бангладэш | Чылі, Гаяна, Сурынам, Гаіці, Ямайка, Грэнада | Эфіопія, Малі, Танзанія, Ангола, Мазамбік | Ірландыя | Папуа — Новая Гвінея |

Мал. 67-2. Эміграцыя медыцынскіх работнікаў па рэгіёнах свету (прыклады краін), 2020 г.

**Свет і Беларусь.** Медыцынская адукацыя ў Беларусі дае замежным студэнтам мноства пераваг, у тым ліку высокі ўзровень адукацыі, даступны кошт, міжнароднае прызнанне дыпломаў, шматнацыянальнае асяроддзе і падтрымку з боку ўніверсітэтаў. Гэтыя фактары робяць Беларусь прывабным выбарам для тых, хто імкнецца атрымаць якасную медыцынскую адукацыю і пабудаваць паспяховую кар'еру ў медыцыне. Міжнароднае прызнанне беларускіх дыпломаў дазваляе выпускнікам працягваць сваю кар'еру і працаваць у розных медыцынскіх установах за межамі Беларусі. Згодна з законам «Аб знешняй працоўнай міграцыі» як студэнты, так і выпускнікі могуць працаваць па сваёй спецыяльнасці без спецыяльных дазволаў.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Павелічэнне маштабаў працоўнай міграцыі прыводзіць да росту колькасці замежнай працоўнай сілы ў структуры працоўных рэсурсаў развітых краін. Па даных Міжнароднай арганізацыі міграцыі, у 2022 г. пяццю краінамі з найбольшым прытокам працоўных мігрантаў сталі Вялікабрытанія (170,3 тыс. чал.), ЗША (145,7 тыс. чал.), Канада (135,8 тыс. чал.), Германія (89,9 тыс. чал.) і Новая Зеландыя (74,8 тыс. чал.).

Сучасныя грамадзянскія войны і змена палітычных рэжымаў прыводзяць да міграцыі насельніцтва па палітычных прычынах. *Палітычная міграцыя* набывае ў свеце ўстойлівыя маштабы. У выніку палітычных канфліктаў і перамяшчэння насельніцтва, якое знаходзіцца пад прыгнётам рознага характару (рэлігійнага, расавага, ідэалагічнага), гэтая форма міграцыі фарміруе бежанства. Сёння колькасць бежанцаў значна меншая за колькасць эканамічных мігрантаў, але ўсё роўна застаецца значнай.

Адной з новых форм выступае *міграцыя высокакваліфікаваных кадраў («brain drain»)*, або *інтэлектуальная міграцыя*. Рэгіёнам з найбольшай эміграцыяй насельніцтва з вышэйшай адукацыяй з'яўляецца Лацінская Амерыка. Больш за 80 % насельніцтва з вышэйшай адукацыяй Грэнады, Гаяны ў 2020 г. пакідалі свае краіны. У шэрагу дзяржаў Афрыкі (Эфіопія, Нігерыя, Кенія, ПАР) больш за 50 % высокакваліфікаваных спецыялістаў эмігруюць. Для гэтых дзяржаў іх ад'езд стварае сур'ёзную праблему для будучага развіцця.

**У свеце цікавага.** Дзяржавамі, якія вядуць найбольш актыўную палітыку па прыцягненні высокакваліфікаваных спецыялістаў, з'яўляюцца ЗША, Вялікабрытанія, Канада і Аўстралія. Найбольшай доляй у свеце замежных вучоных і даследчыкаў вылучаюцца Швейцарыя (57 %), Аўстралія (45 %) і ЗША (38 %).

Рост колькасці моладзі ў краінах, якія развіваюцца, прывёў да фарміравання *студэнцкай міграцыі*. У 2021 г. колькасць студэнтаў, якія навучаюцца за мяжой, складала 6,1 млн чал. (мал. 68). Большасць замежных студэнтаў прадстаўленая афрыканскай,




Мал. 68. Дынаміка студэнцкай міграцыі ў свеце, млн чал.

арабскай і кітайскай моладдзю. Самымі мабільнымі з'яўляюцца студэнты краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары. Кожны 16 афрыканскі студэнт навучаецца за мяжой. Больш за 50 % навучаюцца ў дзесяці краінах: ЗША, Вялікабрытанія, Аўстралія, Германія, Канада, Францыя, Турцыя, Кітай, Нідэрланды і Рэспубліка Карэя. Асноўнымі краінамі паходжання замежных студэнтаў у 2021 г. сталі Кітай (16 % усіх замежных студэнтаў у свеце) і Індыя (8 %).

**Свет і Беларусь.** Па статыстыцы, з кожным годам павялічваецца колькасць замежных студэнтаў, якія атрымліваюць у Рэспубліцы Беларусь вышэйшую адукацыю. Гэта сведчыць пра высокую якасць беларускай адукацыі. Якія спецыяльнасці беларускіх устаноў адукацыі найбольш запатрабаваныя сярод студэнтаў-мігрантаў?

Глабальнае змяненне клімату, прыродныя бедствы прывялі да з'яўлення *кліматычнай міграцыі*. 60 % бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб, па даных за 2022 г., жылі ў краінах, якія адносяцца да ліку найбольш уразлівых да змены клімату. Па прычыне засух і недахопу вады, павышэння ўзроўню мора, стыхійных бедстваў і экстрэмальных тэмператур адбываецца 56 % унутраных перамяшчэнняў мігрантаў у свеце. З 2019 па 2022 г. штогод рэгістравалася больш за 20 млн перамяшчэнняў па прычыне стыхійных бедстваў. Найбольшая частка гэтага насельніцтва прыпадае на тры рэгіёны: Афрыку на поўдзень ад Сахары, Паўднёвую Азію і Лацінскую Амерыку (мал. 68-1–68-3). У пяцёрку краін з найбольшай колькасцю новых унутраных перамяшчэнняў па прычыне стыхійных бедстваў у 2023 г. увайшлі Кітай (4,7 млн чал.), Турцыя (4,1 млн чал.) і Філіпіны (2,6 млн чал.).

П 5

| Краіна | Стыхійнае бедства | Колькасць кліматычных мігрантаў, тыс. чал. |
|---|---|---|
| Індыя | Паводка ў Біхары | 1670 |
| Інданезія | Сезонныя мусонныя паводкі і апоўзні | 949 |
| Кітай | Паводка Янцзы<br>Тайфун Haima<br>Тайфун Megy<br>Тайфун Meranti | 1900<br>782<br>658<br>567 |
| ЗША | Тайфун Matthew | 875 |
| Куба | Тайфун Matthew | 1079 |
| Філіпіны | Тайфун Nock-Ten<br>Тайфун Haima | 2592<br>2376 |

Мал. 68-1. Кліматычная міграцыя свету, 2016 г.




Мал. 68-2. Эпіцэнтры кліматычнай міграцыі свету, 2016 г.

| Рэгіёны | Колькасць насельніцтва, млн чал. | Доля насельніцтва ад колькасці насельніцтва рэгіёна, % |
|---|---|---|
| Паўночная Афрыка | 13,0 | 6,1 |
| Афрыка на поўдзень ад Сахары | 71,1 | 3,5 |
| Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён | 36,2 | 1,9 |
| Паўднёвая Азія | 35,7 | 1,6 |
| Лацінская Амерыка | 10,7 | 1,6 |
| Усходняя Еўропа і Цэнтральная Азія | 3,7 | 1,7 |

Мал. 68-3. Прагноз кліматычнай міграцыі да 2050 г.

Агульная колькасць унутраных кліматычных мігрантаў у свеце да 2050 г. складзе 170 млн чал.

**У свеце цікавага.** Засуха стала вострай праблемай у сувязі са змяненнем клімату. 30 % насельніцтва Афрыкі пражывае ў раёнах, схільных да засухі. Чакаецца, што да 2050 г. засушлівыя ўмовы зменяць жыццё амаль 100 млн афрыканцаў. На Блізкім Усходзе прычынай кліматычнай міграцыі з'яўляецца экстрэмальная спякота. З гарачым пустынным кліматам Блізкі Усход, як прагназуецца, дасягне летніх тэмператур да 46 °C да 2050 г. Гэтыя рэзкія павышэнні тэмпературы ўжо здараліся і зрабілі некаторыя часткі Блізкага Усходу непрыдатнымі для жыцця людзей. Чакаецца, што такія экстрэмальныя ўмовы павялічаць колькасць кліматычных мігрантаў, паколькі людзі будуць шукаць больш прахалодныя і прыдатныя для жыцця рэгіёны.

У асноўным кліматычная міграцыя адбываецца ў межах адной краіны, аднак часам значная частка насельніцтва вымушаная перасяляцца ў іншыя краіны.

**Падвядзём вынікі.** Міжнародная міграцыя — гэта працэс, які склаўся гістарычна. Рэгіёнамі з найбольшай колькасцю міжнародных мігрантаў з'яўляюцца ..., ..., ... . Колькасць міжнародных мігрантаў у свеце пастаянна ... . Для развітых краін характэрнае ... сальда міграцыі, для краін, якія развіваюцца, — ... . Вылучаюць наступныя віды міжнароднай міграцыі: ..., ..., ..., ..., ... .

***Праверым свае веды.*** 1. Чаму міжнародная міграцыя набыла глабальны характар? 2. Чым абумоўленае фарміраванне калідораў міжнародных міграцый? Растлумачце іх геаграфію. 3. Назавіце і пакажыце на карце краіны з самай вялікай доляй замежных рабочых. 4. Назавіце і пакажыце на карце краіны з самай вялікай доляй студэнцкай іміграцыі.

***Ад простага да складанага.*** 1. Патлумачце, чаму прыкладам умелай узаемасувязі міграцыі працоўнай сілы з узроўнем эканамічнага развіцця з'яўляецца Японія. 2. Падумайце, якія краіны з пункту гледжання міжнароднай міграцыі называюцца краінамі-«донарамі», а якія — краінамі-«рэцыпіентамі». 3. Рынак міжнароднай адукацыі стаў важнай крыніцай даходу для прымаючых краін. Назавіце асноўныя фактары, якія спрыяюць росту студэнцкай міграцыі.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Запоўніце ў сшытку табліцу.

Прычыны і геаграфія сучасных міжнародных міграцый

| Віды міграцый | Прычыны міграцый | Адкуль? Куды? |
|---|---|---|
| Палітычная | | |
| Эканамічная | | |
| Працоўная | | |
| Кліматычная | | |
| Студэнцкая | | |

П§ 9-1

## § 9-1. Сучасныя цэнтры прыцягнення міжнародных мігрантаў

***Успомніце.*** Якія асноўныя прычыны сучаснага міграцыйнага руху? Чым абумоўленае ўзнікненне міграцыйных калідораў? Чым абумоўленая ўнутраная міграцыя насельніцтва?

***Для чаго мы гэта вывучаем.*** Якія праблемы сацыяльнага характару выклікае міграцыя? Як паўплывала пандэмія COVID-19 на міграцыйны рух? Якую ролю ў эканоміках дзяржаў адыгрываюць імігранты?

**Фарміраванне новых цэнтраў прыцягнення мігрантаў у канцы XX ст.** З канца 1980-х гг. у свеце пачынае адбывацца *фарміраванне новых цэнтраў прыцягнення імігрантаў*. Самы масавы з іх утварыўся ў краінах *Еўропы*. У гэтым рэгіёне прадстаўленыя многія віды міграцый: працоўная, адукацыйная, палітычная. Еўропа з пастаўшчыка

імігрантаў за акіян ператварылася ў іх «спажыўца». Другі цэнтр, які ўзнік у 1970-х гг., трывала ўсталяваўся *на Блізкім Усходзе*, галоўным чынам з шасці аравійскіх манархій, якія сталі асноўнымі экспарцёрамі нафты ў свеце. Працоўная міграцыя, шмат гадоў звязаная са здабычай нафты, стварае ў гэтым рэгіёне ўнікальную эканамічную і дэмаграфічную сітуацыю. Аналагічныя цэнтры сфарміраваліся ў *Паўднёва-Усходняй Азіі* (Сінгапур, Малайзія, Інданезія, Японія) і *Лацінскай Амерыцы* (Аргенціна, Бразілія, Венесуэла).

Нараўне з фарміраваннем цэнтраў прыцягнення мігрантаў на сусветным рынку працоўнай сілы *з'явіліся асноўныя краіны — пастаўшчыкі працоўнай сілы*:

- у Азіі — Кітай, Індыя, Пакістан, Філіпіны, В'етнам;
- у Афрыцы — Марока, Алжыр, Туніс, Гана, Малі, Гвінея, Каба-Вердэ, Мазамбік;
- у Лацінскай Амерыцы — Парагвай, Балівія, Калумбія, дзяржавы Карыбскага рэгіёна;
- у Паўночнай Амерыцы — Мексіка;
- у Еўропе — Партугалія, Ірландыя, краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

**Сучасныя цэнтры міжнароднай міграцыі.** У канцы першай дэкады XXI ст., калі ў свеце сталі актыўна праяўляцца рысы постындустрыяльнага развіцця і наступствы пандэміі COVID-19, пачало адбывацца фарміраванне новых «гарачых кропак» міжнароднай міграцыі, якія прыцягваюць значную колькасць мігрантаў.

Першай такой «гарачай кропкай» з'яўляюцца *ЗША*. Злучаныя Штаты Амерыкі ў цяперашні час працягваюць прыцягваць больш імігрантаў, чым любая іншая краіна ў свеце. Там пражываюць больш за 50 млн рэзідэнтаў, якія нарадзіліся за мяжой. Прычыны гэтага — шырокія магчымасці для адукацыі, кар'ернага росту і шанец уз'яднацца з сям'ёй. Хоць імігранты прыязджаюць з усіх куткоў свету, лідзіруюць сярод іх Мексіка, Індыя і Кітай (мал. 68-4).




Мал. 68-4. Першыя пяць краін па паходжанні мігрантаў у ЗША, 2023 г., млн чал.

Імігранты адыгрываюць важную ролю ў сучасным развіцці ЗША. Яны занятыя ва ўсіх галінах гаспадаркі краіны: ад харчовай прамысловасці да галін, якія выкарыстоўваюць найноўшыя навуковыя распрацоўкі і тэхналогіі. Ці то Крамянёвая даліна, ці то маленькія амерыканскія гарады, уклад міжнародных мігрантаў, колькасць якіх складае 15 % насельніцтва, адбіваецца на эканоміцы і грамадстве ЗША.

*Германія* з'яўляецца другой «гарачай кропкай» міжнароднай міграцыі і цэнтрам міграцыі ў Еўропе. У краіне пражывае каля 16 млн рэзідэнтаў замежнага паходжання. Гэта шмат у чым абумоўлена яе эканомікай, якая бурна развіваецца, і стратэгічнай роляй у ЕС.

Імігранты з Турцыі, Польшчы і Сірыі складаюць аснову іміграцыі ў Германію, яны робяць свой уклад у розныя галіны — ад вытворчасці да аховы здароўя (мал. 68-5).




Мал. 68-5. Першыя пяць краін па паходжанні мігрантаў у Германіі, 2023 г., млн чал.

Гуманітарныя каштоўнасці Германіі робяць яе ключавым пунктам прызначэння для мігрантаў. Краіна, якая перажыла крызіс бежанцаў 2015 г., падтрымлівае доўгатэрміновую інтэграцыю праз моўныя курсы і прафесійную падрыхтоўку міжнародных мігрантаў.

Хаця праблемы з жыллём і сацыяльнай згуртаванасцю захоўваюцца, уплыў міжнароднай міграцыі заўважны ў культурным жыцці Берліна. Будучы найбуйнейшай эканомікай Еўропы, Германія застаецца месцам прыцягнення для тых, хто шукае бяспеку і магчымасці.

*Саудаўская Аравія* выступае трэцяй «гарачай кропкай» міжнароднай міграцыі. Іміграцкае насельніцтва Саудаўскай Аравіі складае амаль 40 % ад агульнай колькасці жыхароў, што адлюстроўвае ролю краіны як сусветнага цэнтра працоўнай сілы. Рабочыя з Бангладэш, Індыі і Пакістана адыгрываюць найважнейшыя ролі ў сферах будаўніцтва, хатняй гаспадаркі і здабычы нафты, фарміруючы сучасную эканоміку Саудаўскай Аравіі (мал. 68-6).




Мал. 68-6. Першыя пяць краін па паходжанні мігрантаў у Саудаўскай Аравіі, 2023 г., млн чал.

Хаця працоўная палітыка застаецца вострай тэмай для абмеркавання, міжнародная міграцыя адыгрывае важную ролю ў прагрэсе Саудаўскай Аравіі. Ініцыятыва краіны «Vision 2030» мяняе будучыню Саудаўскай Аравіі, ствараючы працоўныя месцы ў новых сектарах, такіх як турызм і забавы. Гэты эканамічны зрух мяркуе з'яўленне яшчэ большай колькасці магчымасцей для кваліфікаваных мігрантаў. Іх уклад не толькі істотны ў ключавых галінах, але і з'яўляецца сувязным звяном паміж Саудаўскай Аравіяй і астатнім светам.

*Аб'яднаныя Арабскія Эміраты* — чацвёртая «гарачая кропка» сучаснай міжнароднай міграцыі. Амаль 90 % насельніцтва ААЭ складаюць імігранты, што робіць краіну адным з самых інтэрнацыянальных месцаў на зямлі.

Краіна — ад раскошных небаскробаў да маштабных будаўнічых праектаў — квітнее за кошт разнастайнай рабочай сілы, вядучую ролю ў якой адыгрываюць мігранты з Індыі, Бангладэш і Пакістана (мал. 68-7).




Мал. 68-7. Першыя пяць краін па паходжанні мігрантаў у ААЭ, 2023 г., млн чал.

Хуткае развіццё ААЭ абумоўленае іх здольнасцю прыцягваць таленты на ўсіх узроўнях, ад працоўных да высокакваліфікаваных спецыялістаў. Іх міграцыйная палітыка развіваецца і ўключае доўгатэрміновыя візы для інвестараў і спецыялістаў, адлюстроўвае прыхільнасць краіны да ўстойлівай будучыні. Нягледзячы на тое, што ў краіне застаюцца актуальнымі пытанні правоў працоўных, ААЭ па-ранейшаму з'яўляюцца прыкладам багацця магчымасцей, якія садзейнічаюць эканамічнаму росту.

*Канада* як пятая «гарачая кропка» сучаснай міжнароднай міграцыі з'яўляецца прывабнай для імігрантаў з усяго свету дзякуючы сваёй інклюзіўнай палітыцы (стварэнне для мігрантаў асяроддзя ўключанасці, удзелу ў канкрэтнай дзейнасці, у палітыцы, што дазваляе ім раўнапраўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, у прыняцці рашэнняў), высокаму ўзроўню жыцця і развітой эканоміцы. Канада — адна з самых прыязных да імігрантаў краін, 8 млн яе рэзідэнтаў нарадзіліся за мяжой (21 % насельніцтва).

Індыя, Кітай і Афганістан уваходзяць у лік асноўных крыніц новых імігрантаў у Канадзе, якіх прыцягваюць магчымасці ў сферы адукацыі, тэхналогій і аховы здароўя (мал. 68-8).




Мал. 68-8. Першыя пяць краін па паходжанні мігрантаў у Канадзе, 2023 г., тыс. чал.

Іміграцыйная сістэма Канады аддае прыярытэт кваліфікаваным работнікам, гарантуючы, што мігранты будуць рабіць уклад у эканоміку, якая расце. Такія гарады, як Таронта і Ванкувер, з'яўляюцца прыкладам шматкультурнага духу краіны, які спалучае тэндэнцыі глабалізацыі з мясцовымі традыцыямі.

У *Аўстраліі* як у шостай «гарачай кропцы» сучаснай міжнароднай міграцыі імігранты складаюць 30 % яе жыхароў, што адлюстроўвае адкрытасць краіны. Краіна прапануе мноства магчымасцей — ад моцнай эканомікі да ўніверсітэтаў сусветнага класа — для тых, хто хоча пабудаваць новае жыццё.

Імігранты з Новай Зеландыі, Кітая і Індыі ўтвараюць самыя вялікія групы, уносячы свой уклад у розныя галіны Аўстраліі, у тым ліку ахову здароўя, інфармацыйныя тэхналогіі і адукацыю (мал. 68-9).




Мал. 68-9. Першыя пяць краін па паходжанні мігрантаў у Аўстраліі, 2023 г., тыс. чал.

Праактыўная іміграцыйная палітыка ўрада, уключаючы шляхі атрымання пастаяннага пасведчання на права жыхарства, палягчае імігрантам уладкаванне і дасягненне поспеху.

*Вялікабрытанія* з'яўляецца сёмай «гарачай кропкай» сучаснай міжнароднай міграцыі і доўгі час была скрыжаваннем для міграцыі. Амаль 14 % яе насельніцтва нарадзілася за мяжой. Гісторыя краіны як сусветнай дзяржавы і яе дынамічная эканоміка працягваюць прыцягваць насельніцтва з такіх краін, як Індыя, Польшча і Пакістан (мал. 68-10).




Мал. 68-10. Першыя пяць краін па паходжанні мігрантаў у Вялікабрытаніі, 2023 г., тыс. чал.

Пасля выхаду з Еўрапейскага саюза (Brexit, British exit) Вялікабрытанія ўвяла новую сістэму іміграцыі, зрабіўшы ўпор на кваліфікаваную міграцыю. Гэта, у сваю чаргу, змяніла структуру імігрантаў, паўплывала на такія сектары, як ахова здароўя і новыя тэхналогіі.

Лондан адлюстроўвае разнастайнасць Вялікабрытаніі, змешваючы ў сабе культуры ўсяго свету. Іміграцыя застаецца рухаючай сілай эканамічнага росту, інавацый і глабальных сувязей Вялікабрытаніі.

**Геаграфія і новыя віды міжнароднай міграцыі ва ўмовах глабалізацыі.** Сусветны рынак працы ў цяперашні час знаходзіцца ў стане глабальных змен. Пандэмія COVID-19 — адзін з фактараў, які матывавалі спецыялістаў па ўсім свеце кардынальна мяняць свой лад жыцця, кар'еру і лакацыю працы.

Развіццё тэлекамунікацыйных тэхналогій у XXI ст. дало магутны штуршок да распаўсюджвання новых форм занятасці, якія характарызуюцца гнуткай лакальнасцю, калі чалавек не прывязаны да офіса і можа аддалена працаваць з любога месца, дзе ёсць доступ да інтэрнэту. Таму ў такіх умовах з'явіўся новы від міжнародных мігрантаў — лічбавыя качэўнікі. *Лічбавыя качэўнікі* — гэта міжнародныя мігранты, якія выкарыстоўваюць аддаленую працу для пастаяннага перамяшчэння. У папулярных курортных кірунках з'яўляюцца супольнасці лічбавых качэўнікаў, якія застаюцца даўжэй звычайных турыстаў. У адрозненне ад масавых турыстаў яны прыехалі з намерам не толькі адпачываць, але і працаваць. Таму лічбавыя качэўнікі адрозніваюцца ад іншых груп турыстаў і мігрантаў перш за ўсё тым, што яны ў большай ступені засяроджаныя на працы пры захаванні высокага ўзроўню мабільнасці.

Лічбавыя качэўнікі — пераважна маладыя людзі ва ўзросце ад 20 да 40 гадоў, значную долю якіх складаюць міленіялы (якія нарадзіліся паміж 1981 і 1996 гг.), выхадцы з развітых краін (ЗША, Вялікабрытанія, Германія, Францыя, Канада, Аўстралія і інш.); большасць з іх з вышэйшай адукацыяй, маюць сярэдні даход і занятыя ў лічбавай сферы (кансалтынг, інтэрнэт-маркетынг, вэб-дызайн, стварэнне інфармацыйных прадуктаў, распрацоўка праграмнага забеспячэння, розныя анлайн-паслугі і г. д.).

Паступова фарміруюцца так званыя хабы лічбавага качэўніцтва, гэта значыць месцы, куды пачынаюць масава прыязджаць лічбавыя качэўнікі. Асноўнымі цэнтрамі прыцягнення лічбавых качэўнікаў з'яўляюцца краіны з недарагім пражываннем і камфортным кліматам.

Лічбавыя качэўнікі зараз складаюць значную дэмаграфічную групу міжнародных мігрантаў. Урады многіх краін пачынаюць звяртаць увагу на гэту тэндэнцыю.

Многія краіны ўжо ўсвядомілі патэнцыял лічбавых качэўнікаў і іх станоўчы ўплыў на эканоміку, увёўшы спецыяльныя візы і праграмы для прыцягнення дыстанцыйных спецыялістаў. Амаль дзве трэці (61,5 %) лічбавых качэўнікаў таксама лічаць, што для іх будуць карысныя спецыяльныя візы. Таму цяпер больш як 50 краін прапануюць візы для лічбавых качэўнікаў, многія з якіх прадугледжваюць падатковыя льготы і льготы за доўгатэрміновае знаходжанне.

Краінамі, якія ў наш час распрацоўваюць найбольш шырокія праграмы для лічбавых качэўнікаў, з'яўляюцца Партугалія, Харватыя, Іспанія і інш.

У пачатку 2023 г. у свеце налічвалася каля 35 млн прафесіяналаў, якія называюць сябе лічбавымі качэўнікамі. Па прагнозах экспертаў, да 2035 г. іх колькасць можа вырасці да мільярда. 25 % лічбавых качэўнікаў старэйшыя за 40 гадоў. Амаль трэць (31,5 %) з іх працуюць поўны працоўны дзень. Больш за палову (51,5 %) зарабляюць ад 10 да 50 тыс. еўра ў год. Амаль дзве трэці (66,1 %) лічбавых качэўнікаў плацяць падаткі ў сваёй роднай краіне, больш за палову (55,1 %) — праводзяць ад 1 да 4 месяцаў у адным месцы прызначэння.

Большасць лічбавых качэўнікаў прыязджаюць з ЗША (37,4 %), далей ідуць Вялікабрытанія (12,3 %) і Германія (5,6 %). *Партугалія* была прызнаная любімай лакацыяй лічбавых качэўнікаў у свеце (27,1 %) (мал. 68-11).




Мал. 68-11. Краіны — лідары па колькасці лічбавых качэўнікаў, 2023–2024 гг., тыс. чал.

Партугалія прапануе візу лічбавага качэўніка і даступнае жыллё. Другое месца па прывабнасці і маштабах лічбавага качэўніцтва займае *Тайланд*. Гэта краіна спалучае ў сабе добрую інфраструктуру і экзатычную прывабнасць. Лідарамі з'яўляюцца гарады Чыангмай і Бангкок. Трэцяе месца займае *Мексіка*. Нізкі кошт жыцця ў Мексіцы і блізкасць да ЗША робяць яе прывабнай, асабліва сярод амерыканцаў.

**Падвядзём вынікі.** З канца 1980-х гг. у свеце пачынае адбывацца фарміраванне новых цэнтраў прыцягнення імігрантаў. Асноўныя краіны — пастаўшчыкі працоўнай сілы на сусветны рынак — гэта …, …, …, …, … . Асноўнымі прычынамі фарміравання новых «гарачых кропак» міжнароднай міграцыі ў першай дэкадзе XXI ст. сталі … і … . Сусветны рынак працы ў цяперашні час знаходзіцца ў стане глабальных змен.

***Праверым свае веды.*** 1. Назавіце асноўныя цэнтры прыцягнення імігрантаў у канцы XX ст. 2. Назавіце і пакажыце на карце «гарачыя кропкі» міжнароднай міграцыі. 3. Чаму з’явіўся новы від міжнародных мігрантаў — лічбавыя качэўнікі?

***Ад простага да складанага.*** 1. Падумайце, ці зменіцца ў хуткім часе рэйтынг пазіцый «гарачых кропак» міжнароднай міграцыі. 2. Чаму краінам выгадна прыцягваць лічбавых качэўнікаў? Адказ абгрунтуйце.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Правядзіце параўнальны аналіз па тэме «Плюсы і мінусы лічбавага качэўніцтва».

## § 10. Бежанства ў сучасным свеце

***Успомніце.*** Па якіх прычынах людзі могуць пакідаць сваю краіну? Якая прычына з’яўляецца асноўнай у сучаснай міжнароднай міграцыі? Якія падзеі вымушаюць людзей пакідаць свае месца жыхарства?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Чаму ўзнікае бежанства? Якія праблемы выклікае бежанства? Як прадухіліць бежанства ў свеце?

**Прычыны бежанства ў свеце.** Адной з форм палітычнай міграцыі з’яўляецца *бежанства*. Гэтая форма міграцыі найбольш моцна закранае правы чалавека і ніколі не бывае добраахвотнай. З другой паловы XX ст. яна носіць глабальны праблемны характар. Праблема бежанцаў — гэта адно з самых складаных пытанняў, якое стаіць сёння перад сусветнай супольнасцю.

***У свеце ўсё ўзаемазвязанае.*** У канцы XX — пачатку XXI ст. бежанства набыло найбольшыя маштабы за ўсю сваю гісторыю. З чым звязанае значнае павелічэнне колькасці бежанцаў? Адказ абгрунтуйце.

Бежанства мае глыбокія гістарычныя карані. Так, у 1951 г. большасць бежанцаў былі еўрапейцамі. Сёння гэта насельніцтва Азіі і Афрыкі. Калі раней бежанства ўяўляла сабой вымушаныя міграцыі асобных людзей, то цяперашнія плыні бежанцаў усё часцей прымаюць масавую форму.

**У свеце цікавага.** Гісторыя чалавецтва поўная трагічных старонак, звязаных з бежанцамі. На пачатку нашай эры каля 300 тыс. готаў беглі ад нашэсця качэўнікаў-гунаў на землі Рыма. Працэс распаду пад ударамі варвараў Рымскай імперыі суправаджаўся беспрэцэдэнтным «вялікім перасяленнем народаў». У VII–IX стст. у выніку спусташальных уварванняў вікінгаў у Брытанію каля 40 тыс. жыхароў вострава мігрыравалі ў Францыю. Тысячы людзей у Еўропе і Азіі беглі ад частых эпідэмій чумы.

Прычыны сучаснага бежанства адлюстраваныя на малюнку 69.

**Прычыны бежанства**

- **гістарычныя**
  - пераслед па прыкмеце расы, веравызнання, грамадзянства
  - пераслед па прычыне прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы або палітычных перакананняў
- **сучасныя**
  - стыхійныя прыродныя бедствы
  - ваенныя канфлікты
  - крайняя галеча
  - экалагічныя катастрофы

Мал. 69. Прычыны бежанства ў свеце

Галоўнай міжнароднай арганізацыяй па забеспячэнні правоў бежанцаў з'яўляецца Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ). Яно было створанае ў 1950 г. і каардынуе міжнародныя дзеянні па абароне бежанцаў і вырашэнні іх праблем незалежна ад расы, веравызнання, палітычных перакананняў і полу ў сусветным маштабе.

**Свет і Беларусь.** Рэспубліка Беларусь мае самы высокі рэйтынг у СНД па адпаведнасці міжнароднаму заканадаўству аб бежанцах і актыўна развівае міжнароднае супрацоўніцтва з УВКБ. Абарона правоў бежанцаў уключае розныя мерапрыемствы, напрыклад па развіцці аб'ектаў для іх прыёму і размяшчэння. Якія валанцёрскія мерапрыемствы вы можаце прапанаваць для дапамогі мігрантам, якія шукаюць прытулак на тэрыторыі нашай краіны?

**Геаграфія бежанства.** Да росту бежанства прыводзяць як палітычныя і ваенныя канфлікты, так і вельмі нізкі ўзровень эканамічнага развіцця некаторых краін. Пры гэтым трэба разумець, што колькасць бежанцаў можа вагацца ў залежнасці

ад актыўнасці падзей, якія адбываюцца. У параўнанні з 1990 г. колькасць бежанцаў у свеце ўзрасла амаль у два разы і складае 37,9 млн чал. (мал. 70). Гэта 13 % міжнародных мігрантаў. У 2024 г. 75 % бежанцаў прынялі краіны, якія развіваюцца, і 25 % — развітыя. 69 % бежанцаў пражывалі ў краінах, якія мяжуюць з краінамі іх паходжання. У цяперашні час 40 % бежанцаў складаюць дзеці і падлеткі ва ўзросце да 17 гадоў, 53 % — насельніцтва ў працаздольным узросце.




Мал. 70. Дынаміка колькасці бежанцаў у свеце, млн чал.

***Паразважаем.*** Як вы разумееце словы Генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша: «Свет уступае ў “новую эру”, калі маштабы глабальнага прымусовага перамяшчэння насельніцтва засланяюць усё бачанае раней»? Адказ патлумачце.

Бежанцы размяркоўваюцца па *краіне паходжання* і па *краіне прытулку (прыёму)*.

Па краіне паходжання найбольшай колькасцю бежанцаў у 2024 г. характарызаваліся **Сірыя**, **Афганістан** і **Украіна** (мал. 71). Асноўнымі прычынамі эміграцыі з'яўляюцца ваенныя дзеянні, нестабільнае эканамічнае становішча, нізкі ўзровень жыцця і інш. Найбольшую колькасць бежанцаў прынялі Іран, Турцыя і Германія (мал. 72).

**Свет і Беларусь.** У Рэспубліцы Беларусь паспяхова рэалізуецца Канцэпцыя міграцыйнай палітыкі на 2024–2028 гг. На 1 ліпеня 2023 г. статус бежанца ў нашай краіне прадастаўлены 1008 іншаземцам з 30 краін свету. Успомніце матэрыял § 3 вучэбнага дапаможніка і выкажыце здагадку, замежныя грамадзяне з якіх рэгіёнаў і краін часцей за ўсё атрымліваюць статус бежанца ў нашай краіне.




Мал. 71. Найбуйнейшыя краіны па колькасці бежанцаў (па краіне паходжання), 2024 г., млн чал.




Мал. 72. Найбуйнейшыя краіны па прыёме бежанцаў, 2024 г., млн чал.

**Геаграфія надзвычайных сітуацый бежанства ў свеце.** Па даных УВКБ, у 2024 г. у свеце вылучалася восем тэрыторый, дзе сітуацыі з бежанствам ацэньваліся як надзвычайныя і якія эксперты называлі гуманітарнымі крызісамі. Гэта тэрыторыі Афганістана, ДР Конга, Бангладэш, М'янмы, Паўднёвага Судана, Украіны, Венесуэлы, тэрыторыя Сахеля (напрыклад, уключае часткі такіх краін, як Сенегал, Маўрытанія, Малі, Буркіна-Фасо, Нігер, Нігерыя, Чад, Судан і Эрытрэя).

Мільёны людзей у *Афганістане* пасля дзесяцігоддзяў канфлікту жывуць у крайняй галечы і галадаюць на фоне эканамічнага крызісу, стыхійных бедстваў, засух, нізкіх зімовых тэмператур і паўсюднага прыцяснення правоў чалавека, асабліва жанчын і дзяўчынак.

У 2024 г. у выніку шматгадовай эканамічнай нестабільнасці і ўсплёску гвалту ў *ДР Конга* амаль 6 млн чал. сталі ўнутрана перамешчанымі асобамі ва ўсходніх правінцыях краіны.

Цэнтральны рэгіён *Сахеля* сутыкаецца з гуманітарным крызісам, які прымусіў пакінуць свае дамы больш за 4 млн чал. Сітуацыя пагаршаецца па прычыне наступстваў кліматычнага крызісу, грамадзянскіх канфліктаў, адсутнасці вады (мал. 73) і харчавання, праблемы голаду.

У 2017 г. у *Бангладэш* з М'янмы беглі больш за 750 тыс. чал. этнасу рахінджа пасля жорсткіх ваенных рэпрэсій. Сёння ў Бангладэш пражывае каля 1 млн бежанцаў рахінджа. Па даных ААН, яны з'яўляюцца адной з самых пераследуемых нацыянальных меншасцей у свеце.



Мал. 73. Жыхары Сахеля ва ўмовах дэфіцыту вады

Грамадзянская вайна ў *Судане* прымусіла больш за 7,5 млн чал. пакінуць свае дамы. Паколькі гвалт працягвае абвастрацца, людзі адчайна шукаюць

бяспекі і абароны як унутры Судана, так і ў краінах, якія мяжуюць з ім, такіх як Чад (мал. 74), Паўднёвы Судан, Егіпет, Эфіопія і ЦАР.

Па прычыне больш чым 12 гадоў палітычнага і эканамічнага крызісу ў *Сірыі* жыццё насельніцтва становіцца ўсё цяжэйшым. Наступствы разбуральных землетрасенняў, якія закранулі Турцыю і паўночную Сірыю, і распаўсюджванне беднасці прымушаюць сірыйцаў бегчы з краіны (мал. 75).



Мал. 74. Лагер суданскіх бежанцаў у Чадзе

УВКБ аказвае гуманітарную дапамогу насельніцтву, якое цярпіць з-за ваеннага канфлікту ва *Украіне*. У Еўропе краінамі, якія найбольш актыўна прымаюць бежанцаў з Украіны, у 2024 г. сталі Польшча, Іспанія, Францыя, Вялікабрытанія.

Рост узроўню злачыннасці, гвалту, голад у *Венесуэле* ў выніку палітычнага і эканамічнага крызісаў прымусілі пакінуць краіну мільёны чалавек. Большасць з іх былі размешчаны ў краінах Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна.



Мал. 75. Найбуйнейшы ў свеце лагер сірыйскіх бежанцаў Заатары ў Іарданіі

Пакажыце на карце краіны з найбольшай колькасцю бежанцаў: Сірыю, Афганістан, Украіну.

**Жэнеўская канвенцыя аб статусе бежанцаў.** Колькасць бежанцаў у свеце павялічваецца, што стварае для краін праблему атрымання статусу бежанца і вызначэння яго выразных прыкмет.

**У свеце цікавага.** Паняцце «бежанец» з'явілася ўпершыню ў 1922 г. у першым пагадненні аб статусе рускіх і армянскіх бежанцаў. У ім былі вызначаны іх правы і прыняты першы праязны дакумент для бежанцаў — нансенаўскі пашпарт (мал. 76). Ён быў названы ў гонар палярнага даследчыка і першага Вярхоўнага камісара па справах бежанцаў Ф. Нансена. У 1942 г. гэты пашпарт прызналі ўрады 52 дзяржаў, і ён дзейнічаў да 1951 г.




Мал. 76. Старонка пашпарта Нансен

Паняцце «бежанец» і яго статус былі прынятыя ў 1951 г. у Жэневе ў Канвенцыі ААН аб статусе бежанцаў. Па вызначэнні ААН, бежанцамі лічацца асобы, якія: 1) могуць стаць ахвярай пераследаў па прыкмеце расы, веравызнання, грамадзянства ці палітычных поглядаў; 2) знаходзяцца па-за межамі краіны сваёй грамадзянскай прыналежнасці і не могуць ці не жадаюць карыстацца абаронай гэтай краіны.

**У свеце цікавага.** Складаныя палітычныя абставіны ў шэрагу краін, якія развіваюцца, Азіі і Афрыкі прыводзяць да павелічэння колькасці людзей, якія падаюць прашэнне аб атрыманні прытулку. У 2024 г. было пададзена каля 8 млн хадайніцтваў аб прадастаўленні прытулку. Найбольшая колькасць новых просьб аб прадастаўленні прытулку атрымлівалі ЗША (3,1 млн), Францыя (689 тыс.), Перу (508 тыс.), Егіпет (435 тыс.), Германія (357 тыс.).

**Міграцыйная палітыка.** У краінах свету складваецца рознае становішча ў галіне міграцыі, актыўнасці патокаў эміграцыі і іміграцыі, а таксама колькасці мігрантаў, якія пакідаюць краіну і якія прыязджаюць у яе. Таму для ўстанаўлення спрыяльнай для краіны міграцыйнай сітуацыі адбываецца яе рэгуляванне.

***Міграцыйная палітыка*** — гэта сістэма прынцыпаў, мэт і дзеянняў, з дапамогай якіх дзяржава рэгулюе патокі міграцыі.

Дзяржаўная міграцыйная палітыка павінна быць накіраваная на дасягненне мэт, якія адпавядаюць інтарэсам развіцця грамадства.

У залежнасці ад міграцыйнай сітуацыі ў краіне, суадносін іміграцыі і эміграцыі ў свеце вылучаюць палітыку ў галіне іміграцыі і палітыку ў галіне эміграцыі. Іміграцыйная палітыка рэгламентуе правілы і нормы прыняцця замежных грамадзян, а эміграцыйная палітыка — выезд грамадзян за мяжу.

У залежнасці ад стаўлення да мігрантаў вылучаюць: 1) *палітыку асіміляцыі* (зліццё аднаго народа з іншым са стратай адным з народаў сваёй мовы і культуры); 2) *палітыку мультыкультуралізму* (уключэнне ў культурны працэс прымаючай краіны элементаў культур эмігрантаў, узаемнае пранікненне розных культур) і 3) *палітыку сацыяльнай інтэграцыі і культурна-моўнай адаптацыі* (паспяховае ўліванне людзей адной этнічнай супольнасці ў сацыякультурную прастору іншай).

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** У абагульненым выглядзе міграцыйную палітыку ў краінах свету можна падзяліць на наступныя віды: 1) міграцыйная палітыка не перашкаджае эміграцыі, але рэгламентуе іміграцыю (напрыклад, ЗША, Канада, Аўстралія і іншыя развітыя краіны); 2) міграцыйная палітыка не перашкаджае эміграцыі і спрыяе іміграцыі (напрыклад, Ізраіль, Германія, нафтаздабываючыя краіны Паўднёва-Заходняй Азіі); 3) міграцыйная палітыка не перашкаджае ні эміграцыі, ні іміграцыі (напрыклад, Туніс, Егіпет); 4) міграцыйная палітыка, накіраваная на закрытасць краіны (КНДР).

**Падвядзём вынікі.** Бежанства — гэта … . Найбольшая колькасць бежанцаў у 2024 г. адзначалася ў …, …, … . У свеце вылучаецца … тэрыторый, у якіх сітуацыя з бежанствам ацэньваецца як надзвычайная. Найбольшая колькасць бежанцаў прынялі такія краіны, як …, …, … . Для ўстанаўлення спрыяльнай міграцыйнай сітуацыі праводзіцца міграцыйная палітыка.

***Праверым свае веды.*** 1. Чым бежанец адрозніваецца ад мігранта? 2. Назавіце асноўныя прычыны бежанства. 3. Які дакумент вызначае статус бежанца? 4. Што такое міграцыйная палітыка?

***Ад простага да складанага.*** Штогод 20 чэрвеня адзначаецца Міжнародны дзень бежанца. Чым выклікана ўвядзенне такога дня? Як вы мяркуеце, якія дзеянні можа распачаць сусветная супольнасць у гэты дзень, каб дапамагчы людзям, якія апынуліся за межамі сваёй краіны.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Напішыце міні-сачыненне на тэму «Ці з'яўляецца права на прытулак універсальным правам чалавека?».

П$_1$

***Ад тэорыі да практыкі.*** Выканайце практычныя работы па тэме «Геаграфія міжнароднай міграцыі».

***Практычная работа 6.*** Аналіз фактараў і дынамікі аб'ёмаў міжнароднай міграцыі ў свеце.

***Практычная работа 7.*** Характарыстыка асноўных калідораў міжнароднай міграцыі па тыпавым плане.

***Практычная работа 8.*** Міграцыйная сітуацыя ў Еўропе: перавагі, праблемы, погляд у будучыню.